## I. *З’яўленне і развіццё ганчарства ў Бабруйскім раёне*

Ганчарны промысел вядомы ў Бабруйскім раёне з даўніх часоў: ім займаліся ў маленькіх вёсках і невялікіх гарадах. Амаль у кожнай сялянскай хаце быў самы просты нажны ганчарны круг, на якім выраблялі разнастайны посуд і які ўжываўся ў гаспадарцы.

Але асноўным цэнтрам ганчарнага рамяства быў прыгарад Бабруйска – пасёлак Керамічны, дзе існавала арцель па вырабу хатняга посуду.

Працавалі майстры цэлымі дынастыямі. Ужываючы простыя прыёмы апрацоўкі гліны, нескладанае абсталяванне, майстры Бабруйшчыны з тонкім густам і віртуознасцю выраблялі сапраўдныя творы мастацтва, шматлікія і разнастайныя рэчы на ганчарным крузе: гаршкі, збаны, гладышкі, слоікі, міскі, макатроны (макацёры), вазоны, талеркі, вугольнікі (4 гаршкі, злучаныя разам і замацаваныя ручкай) і іншыя. Гэтыя вырабы сталі традыцыйнымі формамі народнай керамікі Бабруйскага раёна.

Па ганчарных вырабах можна скласці паданне аб формах сялянскага начыння і выкарыстоўванне яе ў побыце. Гаршкі, макацёры і міскі для прыгатавання ежы, гарлачы і гладышы для малака, слоікі і глякі для захоўвання прадуктаў набылі найбольшую папулярнасць у гаспадынь. А для дзяцей самымі цікавымі і любімымі былі керамічныя цацкі-свістулькі, а таксама фігуркі бараноў, львоў, мядзведзя.

Бытавое ганчарнае начынне бабруйскіх майстроў амаль не мела размалёўкі.

Майстры ганчарнай справы Бабруйскага раёна паступова адкрывалі сакрэты гліны: разабраліся ў яе выглядах, навучыліся складаць рэцэпты глiністых мас, выявілі паліву, стваралі новыя, больш эканамічныя формы вырабаў.

У вёсках Бабруйскага раёна ганчарства звычайна было дадатковым рамяством у гаспадарцы сялян. Навыкі, веды і вопыт звычайна перадаваліся ад бацькоў іх дзецям, сваякам: фармаванне вырабаў з гліны, абпал, абвар і паліва.

З узнікненнем гарадоў керамічная вытворчасць атрымлівае спецыялізаваны рамесны характар. У гэты перыяд ускладняецца тэхналогія вытворчасці ганчарных вырабаў, з’яўляюцца новыя формы апрацоўкі керамікі.

У канцы XIX – пачатку XX ст. у Бабруйску і Бабруйскім раёне працавала каля 60 майстроў-керамістаў.

Значныя змены ў развіцці ганчарства наступілі ў паслярэвалюцыйныя часы: разбураная прамысловасць не магла забяспечыць насельніцтва неабходнай прадукцыяй, таму ўзрос попыт на ганчарныя вырабы. Гліны ў акрузе Бабруйска было дастаткова, хапала і паліва.

Слава аб мясцовых бабруйскіх ганчарах прайшла па ўсёй Магілёўшчыне. Іх запрашалі на кірмашы, якія праводзіліся на Каляды, Масленіцу, Тройцу, Спас, Пакровы, і на якія прыязджалі цэлыя караваны калёс і абозаў:

традыцыйныя гліняныя вырабы хутка раскупаліся. Попыт апярэджваў прапанову.

У канцы 20-х – пачатку 30-х гг. ХХ ст. у в. Цітаўка Бабруйскага раёна пачало развівацца ганчарства як рамяство. З'явіліся і першыя рамеснікі-ганчары: С. Г. Гаўрылаў, А. Д. Лішкевіч, У. Д. Прозыраў, Д. С. Сынкавец, у якіх былі свае маленькія ганчарні (спецыяльныя памяшканні для вытворчасці ганчарных вырабаў саматужным спосабам) і горны для абпалу вырабаў.

Міхаіл Іванавіч Ламака – сямідзесяцігадовы майстар-кераміст у трэцім пакаленні таксама вучыўся ад бацькі і дзядзькі і ведаў сапраўдныя сакрэты ганчарства і ахвотна адкрываў іх сваім вучням, адным з якіх быў Ю. І. Боўда.

Разам з М. І. Ламакам працавалі сапраўдныя майстры, улюблённыя ў кераміку: У. Д. Прозыраў, С. Г. Бубчыкаў, С. А. Лугін.

З-пад іх рук выходзілі цудоўныя керамічныя вырабы, якія славіліся на рынке побыту.

У мастацкім абліччы гліняных вырабаў бабруйскіх майстроў праглядвае ярка падкрэсленая прыродная прыгажосць матэрыялу.

Бабруйская кераміка вылучаецца своеасаблівымі прапорцыямі, спалучэннем бескаляровай палівы з багатым каларытам святла – чырвоных глін, сціплымі дэкарыраванымі абводкамі і штампікамі, асаблівасцямі ў канструкцыі накрывак і ручак, а таксама чысцінёй форм, колеру, лаканічнасцю пластыкі і дэкору. Гэтаму спрыяла мясцовая сыравіна, майстэрства рамеснікаў, тэхналагічны ўзровень вытворчасці, ганчарныя традыцыі.

Роспіс посуду ў Бабруйскім раёне з'явіўся значна пазней (так званы ангобны роспіс белай глінай па чырвонай прыйшоў на Бабруйшчыну з Украіны).

Усе гэтыя асаблівасці майстры ганчарства і керамікі захоўваюць і сёння, як і сакрэты найстаражытных мастацкіх прыёмаў апрацоўкі гліняных вырабаў.

Сёння ў г. Бабруйску і Бабруйскім раёне ганчарнае рамяство развіваецца дзякуючы сапраўдным майстрам і прыхільнікам керамікі: аматарскім аб'яднанням "Стары майстар" і "Беларуская мастацкая кераміка", ганчарным рамесніцкім майстэрням.

Ганчары Бабруйскага раёна пад кіраўніцтвам Ю. І. Боўды не толькі зберагаюць і адраджаюць традыцыйную тэхналогію гліняных вырабаў, але і прыўносяць новае ў тэхналагічны працэс, пры гэтым у кожнага майстра застаецца свой стыль, адчуванне прыгожага.

Майстры Бабруйшчыны праводзяць работу па афармленню інтэр'ера ўстаноў культуры: робяць каміны, вазы, гаршкі пад кветкі, свяцільнікі, і самі не перастаюць вучыцца, удасканальваць сваё майстэрства – прымаюць удзел у шматлікіх выставах.

Дзякуючы такім майстрам, ганчарнае рамяство, тэхналогія ганчарных вырабаў на Бабруйшчыне і далей будзе развівацца, набываючы ўсё больш прыхільнікаў і паслядоўнікаў.

## *II. ГЛІНА : АД КОПАНКІ ДА ВЫРАБУ*

Як сведчаць археалагічныя знаходкі, нашы продкі навучыліся апрацоўваць гліну яшчэ ў эпоху неаліту.

З даўніх часоў чалавецтва ляпіла з гліны неабходныя ў гаспадарцы прадметы і перш за ўсё посуд. Аднак, посуд з няпаленай гліны вельмі далікатны і да таго ж баіцца вільгаці.

Заграбаючы попел вогнішча, старажытны чалавек заўважыў, што ў тым месцы, дзе гарэла вогнішча, гліністая глеба станавілася цвёрдай і не размывалася дажджамі.

Магчыма гэтае назіранне і прывяло чалавека да абпальвання посуду на вогнішчы. Абпаленыя вырабы ўвайшлі ў побыт пад назвай “кераміка”, што ў перакладзе азначае “гліна”.

Гліна ў прыродным асяроддзі настолькі разнастайная па складу, што ў нетрах зямлі можна знайсці гатовую да лепкі і працы гліну (ад фаянсу да чырвонай цагліны). На тэрыторыі Бабруйскага раёна распаўсюджаны паклады сера-зялёнай гліны, прыгоднай для вырабу гаспадарчага посуду, а таксама дробнай пластыкі.

Да нашых дзён дайшла старая загадка: "Быў я на копанцы, быў я на топанцы, быў я на кружале, быў я на пажары, быў я на абвары. Калі малады быў, то людзей радаваў, а стары стаў, спавівацца стаў".

Да нядаўняга часу кожны вясковы жыхар Бабруйскага раёна хутка разгадаў бы яе, – бо гэта звычайны гліняны збан. А сама загадка падрабязна распавядае пра яго "жыццёвы шлях".

"Копанцамі" ў вёсках Бабруйскага раёна звалі ямы, дзе здабывалі гліну. Ганчары паважна казалі пра яе: "жывая". "Жывая плыта", якая сустракаецца на Бабруйшчыне, вельмі разнастайная па складу, і таму можна знайсці гатовую сумесь для вырабу керамікі.

Бабруйская зямля вельмі бедная, таму сеялі мала і жылі з ганчарнага круга. У гэтых месцах проста каласальныя запасы высакаякаснай гліны. Яна валодае ўнікальнай здольнасцю захоўваць тэмпературу і не ўтрымлівае шкодных прымешак.

Але знайсці адпаведную гліну справа непростая: не ўсякая гліна падыходзіць для керамікі. Напрыклад, для пасудзін з бліскучай чорнай паверхняй (“чёрнодощеной”) лепш за ўсё падыходзіць тоўстая жалезістая гліна, якая вельмі пластычная, выдатна трымае форму, а пасля падсыхання лёгка выгладжваецца да люстранага бляску.

У кожнага ганчара былі свае запаветныя "копанцы", якія ён старанна хаваў і засцерагаў ад староніх вачэй. У кожнай такой "копанцы" хаваліся розныя гліны.

Колер "жывой гліны" зманлівы. Высушаная на паветры, яна, як правіла, толькі трохі святлее. Але пры абпале большасць гліны рэзка змяняе свой колер: зялёная становіцца ружовай, бурая – чырвонай, сіняя і чорная – белай. Толькі белая гліна і пасля абпалу застаецца белай.

Каб дабрацца да патрэбнай гліны, прыходзіцца здымаць амаль два метры пласта. Але на Бабруйшчыне гэта нікога не палохае – прывучаныя дзядамі і прадзедамі.

Здабыўшы гліну, ганчар складаў яе ў "гліннік" – адмысловую яму, сцены якой рабілі з бярвення, дах – з тоўстых дошак. Яму залівалі вадой і вытрымлівалі ў ёй гліну ад трох месяцаў да некалькіх гадоў, дзе яна мокла пад дажджамі, мерзла на марозе, парылася на сонцы. Пры гэтым гліна пушылася ад шматлікіх трэшчынак, у ёй акісляліся шкодныя арганічныя прымескі, з яе вымываліся солі. І чым даўжэй вылёжвалася гліна ў глінніку, тым якасней яна станавілася.

Потым надыходзіла чарга пабываць гліне на "топанцы", дзе добра зляжалую гліну разміналі. Рабілі гэта на падлозе ганчарні ці проста на падлозе хаты, папярэдне пасыпаўшы яе пяском.

Прамінкай гліны ("топаннем") займалася ўся сям'я, у тым ліку і дзеці. Гліну таптали нагамі пакуль яна не ператваралася ў тонкі ліст. Яго скочвалі ў рулон, складалі напалову і зноў тапталі. Потым зноў і зноў, пакуль гліна не ператваралася ў аднастайную масу – "глінянае цеста".

І ўжо перад самай лепкай ганчар "перабіваў" гліну. Для гэтага ён катаў з глінянага цеста калабок, які з сілай кідаў на стол, сплюскаў яго ў шар і ганчарнай струной (сталёвым дротам з драўлянымі ручкамі) разразаў напалову.

Палоўкі зноў кідаў на стол і зноў разразаў. Пры гэтым струна выштурхвала дробныя каменьчыкі, выцісківала пакінутыя бурбалкі паветра. І толькі потым старанна падрыхтаваная, аднастайная гліняная маса трапляла на ганчарны круг – "кружала".

Прыемна назіраць за цудам, калі кавалак гліны на крузе ператвараецца ў посуд.

З вільготнай, добра вымешанай гліны ганчар мог за некалькі хвілін зрабіць гаршок, кубак, макацёр ці іншую патрэбную ў гаспадарцы рэч. Кавалак гліны ў яго руках сплёскваўся, выцягваўся, сценкі пасудзіны падымаліся, станавіліся танчэй і набывалі задуманую форму.

Спосабам саматужнай фармоўкі стала "выцягванне" пасудзін з суцэльнага кавалка гліны з дапамогай каменя-галыша і драўлянай лапатачкі.

Спачатку доўгі час ганчары Бабруйшчыны фармавалі свае вырабы саматужна. Нават сёння многія вядомыя ганчары аддаюць перавагу абыходзіцца без механічных прыстасаванняў.

Пасля гэтага вырабы абпальвалі ў выкапаных у зямлі ямах, цаглянай ці рускай печках. Посуд "грузілі" ў печ з вечара, абкладвалі дровамі. Печ затаплівалі раніцай, і паступова падымалі тэмпературу. Абпал завяршаўся калі

вырабы пачыналі чырванець. Але яшчэ да раніцы наступнага дня вырабы заставаліся ў печы: мяккая, пластычная гліна ператваралася ў цвёрды чарапок.

Можна гадзінамі любавацца на простыя ганчарныя гаршкі – тэракотавыя, без палівы.

Колер, фактура, форма – усё непаўторна!

Гаршок пачынае жыць сваім жыццём: спачатку яго, як дзіця, вучаць трымаць ваду – гэта галоўнае.

Далей ён спраўляецца сам – захоўвае змешчаныя ў ім прадукты: дае ім дыхаць, астуджае. Пры гэтым ён, як чалавек, змяняецца – прыціраецца, мяняе колер, становіцца родным.

Можа таму старыя, нават пабітыя і трэснутыя збаны ніколі не выкідвалі, а давалі ім другое жыццё: гаспадыні ўвіналі гаршкі, збаны вузкімі, распаранымі стужкамі бяросты, як-быццам спавівалі, і ў такім выглядзе яны служылі яшчэ доўгі час, іх прыстасоўвалі пад сыпкія прадукты, ставілі пад вадасцёкі, гаршкі з кветкамі.